# ПАДЫХОДЫ ДА КАМПЛЕКТАВАННЯ ФОНДАЎ БЕЛАРУСКІХ МАСТАЦКІХ МУЗЕЯЎ

***І. А. Юдзіна,***
*аспірант кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Музей, па вызначэнні, прыведзеным у першым пункце 159 артыкула Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс), – гэта «арганізацыя культуры або падраздзяленне юрыдычнай асобы, якія выяўляюць прадметы музейнага значэння, камплектуюць музейныя фонды, ажыццяўляюць на пастаяннай аснове ўлік і захоўванне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыю музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў» [3, с. 137]. Дадзенае вызначэнне называе асноўныя кірункі дзейнасці музеяў. На першым месцы знаходзіцца менавіта выяўленне прадметаў музейнага значэння і камплектаванне фондаў, бо прадмет – гэта падмурак існавання і функцыявання музея як установы. Калекцыі музейных прадметаў вызначаюць профіль установы, тэматыку і метады экспазіцыйнай, даследчай, культурна-адукацыйнай, маркетынгавай – усіх напрамкаў дзейнасці. Таму камплектаванне фондаў – адна з галоўных задач працы музея.

Дзяржаўны рэестр музеяў Рэспублікі Беларусь змяшчае 14 установаў мастацкага профілю. Заўважна блытаніна ў вызначэннях профілю музейнымі супрацоўнікамі. Некаторыя музеі вядомы як установы *мастацтвазнаўчага профілю* [1], іншыя – *мастацкага* (што адпавядае сусветнай практыцы) [1], а ў трэціх – профіль *мастацкі (мастацтвазнаўчы)* [1]. Такая блытаніна не здзіўляе, бо ў кодэксе сустракаюцца абедзве назвы профіляў музеяў. Напрыклад, у артыкуле 161 «Класіфікацыя музеяў» п. 4.3. называе профіль «мастацкі» [3, с. 138]. Артыкул 165 змяшчае вызначэнне музея *мастацтвазнаўчага профілю* [3, с. 142]. Адсутнасць у асноўным заканадаўчым дакуменце адзінага вызначэння прыводзіць да варыятыўнасці самавызначэння прафесіяналамі. Дадзеная тэрміналагічная праблема з'яўляецца важнай, але выходзіць за межы вызначанай намі тэмы. Відавочна, незалежна ад самавызначэння свайго профілю (мастацкі ці мастацтвазнаўчы) прынцыповая розніца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці саміх музеяў аўтарам не выяўлена. Таму ў нашым артыкуле ўжываецца агульнапрыняты ў сусветнай музеялогіі тэрмін «мастацкі».

Стаўленне да камплектавання калекцый як галоўнага напрамку дзейнасці музея супадае ў заканадаўчых дакументах і дыскусіях супрацоўнікаў музеяў [3, 4]. Аднак тэндэнцыі і трэнды камплектавання фондаў не абмяркоўваюцца ў беларускім музеязнаўстве. Аналагічная сітуацыя па дадзеным пытанні ў Расіі. Пра гэта піша А. М. Шолахаў – прэзідэнт ІКОМ Расіі [2, с. 8] ва ўступным слове да кнігі «Новые тренды в музеологии». Першая глава кнігі «Развитие коллекции и концепт динамической коллекции» прысвечана пытанню камплектавання фондаў.

Музеі ў залежнасці ад сваёй спецыфікі, рэгіёна выкарыстоўваюць розныя падыходы да камплектавання фондаў, што фіксуецца ў перспектыўным плане камплектавання фондаў і канцэпцыях развіцця музея ў цэлым ці яго калекцый.

Падыходы да выяўлення прадметаў музейнага значэння можна падзяліць на сінхронныя і дыхранічныя, абодва ўжываюцца ў практыцы музейных супрацоўнікаў нашай краіны.

Аўтары кнігі, П. ван Менш і Л. Мейер-ван Менш называюць асноўныя тэндэнцыі сусветнай збіральніцкай музейнай дзейнасці. Першая – «рэтраспектыўная арыентацыя» пры фарміраванні музейнага фонду [2, с. 22]. Гэта традыцыйны падыход. Сённяшнія тэмпы развіцця тэхналогій, медыямастацтва вымушаюць пераглядзець падыходы музейных супрацоўнікаў да працы па стварэнні калекцый. Музеі сучаснага мастацтва сутыкнуліся з дадзеным трэндам. Спосабы захавання, вывучэння твораў медыямастацтва актыўна абмяркоўваюцца. Дадзеная праблематыка падымалася на XIX Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Аладаўскія чытанні – 2021» яшчэ 27 мая ў Мінску.

Наступная сучасная тэндэнцыя камплектавання фондаў, якую называюць нідэрландскія музеёлагі, – гэта «перспектыўнае калекцыяніраванне» [2, с. 25]. Заключаецца яна ў тым, што музеі набываюць рэч на стадыі ідэі, альбо падчас яе стварэння. Мастацкія музеі Беларусі, якія займаюцца зборам твораў народнага і/або дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, практыкуюць дадзены падыход. Напрыклад, Веткаўскі музей стара-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава замаўляе творы ў ткачых в. Неглюбка.

Мастацкія музеі Беларусі для папаўнення сваіх фондаў выкарыстоўваць розныя спосабы:

– экспедыцыі;

– даследчыя праекты (выратаванне старажытных знакаў – Веткаўскі музей старaабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава);

– набыццё калекцый (мастака, калекцыянера, з асабістага архіва і г. д.);

– пленэры;

– дарэнне твора па выніках асабістай выставы і інш.

Прыкметна, што цяпер музеі свету маюць свае канцэпцыі дзейнасці музеяў, камплектавання фондаў. Разуменне значэння фондаў музея ўвасобілася ў стварэнні Міжнароднага камітэта па калекцыяніраванні ІКОМ (International Committee for Collecting) у 2009 г. [2, с.17]. Гэта значыць, што практыка канцэптуалізацыі збіральніцкай дзейнасці дапамагае зрабіць калекцыю музея больш якаснай, каштоўнай. Трэба накіраваць высілкі супрацоўнікаў музея (якія заўсёды моцна абмежаваныя колькасцю) на выяўленне сапраўдных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Такім чынам, сучасным беларускім мастацкім музеям уласцівы ўсе адзначаныя ў артыкуле і функцыянуючыя ў сусветнай музейнай практыцы падыходы да камплектавання фондаў.

*1.* Дзяржаўны рэестр музеяў Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://cdn.dkmf.by/RegisterOfMuseums.pdf. – Дата доступу: 30.06.2021.

*2. Менш П. ван.* Новые тренды в музеологии / П. ван Менш, Л. Мейер-ван Менш ; пер. с англ. В. Г. Ананьева. – М. : Перспектива, 2021. – 128 с.

*3.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : уступае ў сілу з 3 лютага 2017 г. – Мінск: Нац. Цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2016. – 272 с.

*4.* Этический кодекс ИКОМ для музеев : принят на 15-й Генеральной Ассамблее ИКОМ 4 ноября 1986 г. в Буэнос-Айресе (Аргентина) с изменениями 6 июля 2001 г. и 8 октября 2004 г. ; пер. и ред. М. Гнедовский [Электронный ресурс] // ИКОМ России. – Режим доступа: https://icom-russia.com/upload/documents/%20code_russia2013-1.pdf – Дата доступа: 30.06.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ